# Становішча праваслаўнай царквы ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) у адлюстраванні сучаснай польскай гістарыяграфіі

**Цымбал Аляксандр Георгіевіч,**
Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)

*У артыкулы прадстаўлены асноўныя падыходы сучаснай польскай гістарыяграфіі да праблемы становішча праваслаўнай царквы ў Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд.*

Становішча Заходняй Беларусі ў складзе міжваеннай польскай дзяржавы належыць да мала даследаваных пытанняў у сучаснай польскай гістарыяграфіі, што ў поўнай меры датычыцца і праблемы сітуацыі праваслаўнай царквы. Усталяванне савецкага рэжыму пасля II Сусветнай вайны стала прычынай абмежавання вывучэння вызначанай праблемы да канца 80 – пачатку 90-х гг XX ст. У СССР інтэрпрэтацыя знаходжання заходнебеларускага рэгіёну ў сладзе Польшчы разглядалася як праява каланіяльнай палітыкі,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

а канфесійная гісторыя вывучалася ў рамках барацьбы рабочых супраць “клерыкалізму”. У самой пасляваеннай сацыялістычнай Польшчы тэматыка т. зв. “крэсаў усходніх” фактычна знаходзілася на перыферыі навуковых інтарэсаў гісторыкаў па прычыне ідэалагічных абмежаванняў і недасяжнасці для польскіх даследчыкаў савецкіх архіваў. Пасля распаду Савецкага Саюзу, знікнення ідэалагічных табу ў польскай гістарыяграфіі, а таксама, дзякуючы палягчэнню доступа да беларускіх архіваў, узніклі якасна новыя даследчыя магчымасці, што спрыяла з’яўленню новых навуковых прац прысвечаных вывучэнню становішча рэлігійных арганізацый у ІІ Рэчы Паспалітай.

У цэнтры ўвагі даследчыкаў канфесійнай гісторыі міжваеннай польскай дзяржавы ляжаць пытанні ўзаемаадносін праваслаўнай царквы з уладамі і вызначэння яе прававога становішча, дачыненні з каталіцкім касцёлам, эканамічная сітуацыя царквы і праблема рэвіндыкацыі. Шмат увагі надаецца нацыянальнаму пытанню, якое накладаліся на рэлігійныя стасункі. Праваслаўная царква ў міжваенны перыяд адыгрывала значную ролю ў грамадскім жыцці, а рэлігійная сфера з’яўлялася прасторай канфліктаў, у першую чаргу паміж праваслаўнымі і каталікамі, а таксама дзяржаўнай адміністрацыяй. Сутнасцю напружаных адносін былі не пытанні тэалогіі, а грамадска-палітычныя, эканамічныя і культурныя працэсы. Каталіцызм традыцыйна атаясамліваўся з польскасцю, а праваслаўная царква з Расіяй. Складаная гісторыя ўзаемаадносін Польшчы з Расійскай дзяржавай цалкам адбіваліся на ўзаемаадносінах каталіцкага касцёла, польскай адміністрацыі і праваслаўнай царквы. Але ні каталіцкае польскае насельніцтва і ўлады, ні праваслаўныя рускія іерархі царквы не ўспрымалі змены, якія адбываліся сярод іх вернікаў, а менавіта абуджэнне нацыянальнай свядомасці беларусаў і ўкраінцаў. Для выхаванага ў рускім манархічным духу праваслаўнага духавенства ўсе ўсходнеславянскія народы павінны былі быць звязаны з рускім праваслаўем і Маскоўскім патрыярхатам. Палякі глядзелі на праваслаўную царву як сродак русіфікацыі і імкнуліся далучыць грамадства Заходняй Беларусі да каталіцка-лацінскай культуры [калбук, 7–8].

Пры аналізе сучаснай польскай гістарыяграфіі выразна бачна разыходжанне ў ацэнках становішча праваслаўнай царквы ў ІІ Рэчы Паспалітай і Заходняй Беларусі. Адным з першых аўтараў, хто ў 1989 г. стварыў цэласную карціну праваслаўя ў міжваеннай польшчы была М. Памежыньска-Турэк. Даследчыца разглядала палітыку польскай дзаржавы адносна праваслаўя з перспектывы інтэграцыі ўсходніх тэрыторый населеных беларусамі і ўкраінцамі. Па яе меркаванні, дзейнасць урада накіраваная на ўзмацненне ідэнтыфікацыі непольскага насельніцтва з Польшчай ляжала ў накірунку нацыянальнай асіміляцыі і адмовы ад істотных для беларусаў і ўкраінцаў каштоўнсцей: мовы, традыцый, веравызнання і дзяржаватворчых памкненняў [1, с. 443]. Аўтар крытычна разглядала палітыку ўлад да царквы, характарызуючы як інструментальную, накіраваную выкарыстанне праваслаўнай царквы ўрадам для ўмацавання польскай дзяржаўнасці або нават на выкараненне праваслаўя [2].

Фундаментальнасцю вызначаюцца даследаванні вядомага знаўцы гісторыі праваслаўнай царквы ў Польшчы А. Мірановіча [3]. Навукоўцам вывучаліся практычна ўсе бакі функцыянавання царквы ў ІІ Рэчы Паспалітай. Аднак яго працы носяць пераважна аглядны характар, у асноўным у іх ахарактарызаваны праграмныя ўстаноўкі канфесіянальнай палітыкі польскіх улад. Паводле аўтара, праваслаўная царква польскімі ўладамі разглядалася як інстытут былой Расійскай імперыі, а ў выніку палітыкі рэвіндыкацыі ў царквы было адабрана больш за 400 храмаў [3, с. 767; 4]. Неабходна адзначыць, што даследаванні А. Мірановіча маюць выразны



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

канфесійны характар і інтэрпрэтуюць гісторыю царквы з пераважна праваслаўнага пункту гледжання, ствараючы дастаткова аднамерны вобраз гісторыі.

У выдадзенай у 2013 г. працы В. Калбука "Праваслаўная царква ў міжваеннай Польшчы" праблема прадстаўляецца з іншага пункту гледжання. Аўтар сцвярджае, то рэвіндыкацыя, разбурэнні цэркваў, неаўнія, навязванне праваслаўнай царкве прававых нормаў згодных з польскімі дзяржаўнымі інтарэсамі нельга называць перасследам праваслаўя ў Польшчы. Па яго меркаванні, падобны погляд паўстаў у гістарыяграфіі, бо большасць публікацый звязана з праваслаўным асяроддзем, якое імкнулася абараніць сябе. В. Калбук лічыць, што праблему праваслаўя неабходна разглядаць комплексна, з улікам сітуацыі не толькі ў міжваеннай Польшчы, але і СССР, дзе праваслаўная царква зведала велізарны тэрор. У такім кантэксце ацэнка дзяржаўна царкоўных адносін у Польшчы як праследванне з'яўляецца інсінуацыяй і не адпавядае рэчаіснасці. Цяжкасці праваслаўнай царквы былі аб'ектыўна выкліканы неабходнасцю прыстасавання да новых дзяржаўна-палітычных умоў, што, зразумела, выклікала фрустрацыю ў духавенства і вернікаў. Як падкрэслівае В. Каблук, гэта не азначае, што ў палітыцы адносна праваслаўнай царквы не былі зроблены памылкі, але ў цяжкі міжваенны час, поўны канфліктаў і небяспекі, немагчыма было адназначна і хутка вырашыць, якія дзеянні і метады ўзаемаадносін з праваслаўнай царквой будуць верныя ў доўгатэрміновай перспектыве [5, с. 9]. Адпаведна асновай польскай палітыкі адносна праваслаўных вернікаў не з'яўлялася імкненне да ліквідацыі канфесіі, а каталіцкая царква, паводле аўтара, толькі шукала жадаючых сярод праваслаўных да пераходу ў каталіцызм. Калі і здараліся выпадкі, якія парушалі дабраахвотны прынцып, то яны былі спарадычныя і выпадковыя. Як лічыць В. Калбук, створаны ў гістарыяграфіі вобраз пераследуемай царквы з'яўляецца непраўдзівым і выцякае з асабістых перакананняў даследчыкаў, тэндэнцыйнасці выкарыстаных крыніц або адсутнасці шырокага погляду на гісторыю праваслаўя на польскіх землях [5, с. 166–167].

Такім чынам, з канца 80 – пачатку 90-х гг. ХХ ст. у польскай гістарычнай навуцы з'явіўся шэраг даследаванняў прысвечаных гісторыі праваслаўнай царквы ў міжваеннай Польшчы, часткай якой з'яўляліся заходнебеларускія тэрыторыі. Для сучаснай польскай гістарыяграфіі характэрна выразнае разыходжанне метадалагічных падыходаў: даследванне гісторыі царквы ў кантэксце нацыянальнай палітыкі ўлад і праблемы інтэграцыі ўсходніх зямель, канфесійны праваслаўны погляд на гісторыю царквы ў польскай дзяржаве, а таксама, апалагетычны падыход, прадстаўлены ў апошнія гады, які фактычна легітымізуе дзеянні польскага ўраду і каталіцкай царквы адносна праваслаўя.

**Літаратура**


1. *Papierzyńska-Turek, M.* Między tradycją a rzeczywistością. Państwo wobec prawosławia w 1918–1939 / M. Papierzyńska-Turek. – Warszawa : PWN, 1989. – 482 s.
2. *Papierzyńska-Turek, M.* Chcieli prawosławie w Polsce wykorzenić / M. Papierzyńska-Turek // Przegląd prawosławny. – 1998. – № 7. – S. 6–9.
3. *Mironowicz, A.* Kościół prawosławny w Polsce / A. Mironowicz. – Białystok : Zakł. Poligraficzny OFFSET-PRINT, 2006. – 917 s.
4. *Mironowicz, A.* Rewindykacja prawosławnych obiektów sakralnych w II Rzeczypospolitej / A. Mironowicz // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2004. – № 21. – S. 83–103.
5. *Kołbuk, W.* Cerkiew prawosławna w Polsce międzywojennej / W. Kołbuk. – Lublin : KUL, 2013. – 244 s.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова